www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

17 сакавіка 2005 года, № 6 (1914)

**2005 — ГОД ФІЗІКІ**

# УСЁ ДОБРАЕ І ДРЭННАЕ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ — АД ФІЗІКІ

*Арганізацыя Аб'яднаных Нацый аб'явіла 2005-ы — годам фізікі. Як уплывае фізіка на развіццё грамадства? Якія асноўныя тэндэнцыі развіцця фізічнай навукі ў свеце, якая роля БДУ ў развіцці фізікі? Пра ўсё гэта рэдактар газеты "Беларускі універсітэт" гутарыць з прафесарам, доктарам фізіка-матэматычных навук, Заслужаным дзеячам навукі Беларусі, дэканам фізічнага факультэта Віктарам Міхайлавічам АНІШЧЫКАМ.*

**— Чаму менавіта сёлета вырашана адзначыць год фізікі?**

— Найвыдатнейшы фізік Эйнштэйн 100 гадоў таму апублікаваў тры фундаментальныя працы, якія перавярнулі свет: аб броўнаўскім руху, спецыяльнай тэорыі адноснасці і фотаэфекце. Самая вядомая з іх сёння — спецыяльная тэорыя адноснасці, але Нобелеўскую прэмію ён атрымаў за працу па фотаэфекце. Таму 1905 год лічыцца пачаткам сучаснай фізікі. І праз 100 гадоў чалавецтва вырашыла адсвяткаваць гэты юбілей.

Год фізікі адзначаецца ва ўсім свеце. У Беларусі на пачатку чэрвеня пройдзе нацыянальны кангрэс фізікаў, куды збяруцца не толькі навукоўцы ї выкладчыкі ВНУ, але і настаўнікі фізікі з усёй краіны.

Апошнім часам ва ўсім свеце назіраўся крызіс гэтай навукі: усе хочуць быць юрыстамі, эканамістамі, псіхолагамі, але не фізікамі. Урады некаторых краін нават пачалі распрацоўваць спецыяльныя праграмы па адра-

(Заканчэнне на 2-й стар.)





**ДА 60-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ**

# СТУДЭНТЫ ПІШУЦЬ ПРА ВАЙНУ

*1 сакавіка завяршыўся прыём работ на II тур Рэспубліканскага конкурсу творчых работ навучэнцаў і студэнтаў "Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа".*

Арганізатары конкурсу — Савет спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у рамках мэтавай праграмы "Грамадазнаўству XXI стагоддзя — ініцыятыву і творчасць таленавітай моладзі Беларусі". У склад аргкамітэта ўвайшлі першы намеснік міністра адукацыі А.І. Жук, в.а. дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.А. Каваленя, дырэктар Інстытута дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Адміністрацыі прэзідэнта С.В. Рашэтнікаў, прарэктар БДУ, доктар эканамічных навук, прафесар У.Л. Клюня і іншыя.

Першы тур конкурсу адбыўся ў снежні 2004 г. — студзені 2005 г. у форме канферэнцый, якія прайшлі на кожным з факультэтаў. У БДУ ў канферэнцыях прынялі ўдзел каля 600 студэнтаў, прагучала больш за 100 дакладаў і выступаў. Так, на гістарычным факультэце з пленарным дакладам выступіў доктар гістарычных навук, прафесар А.А. Каваленя, працавалі 6 секцый, дзе прынялі ўдзел 116 студэнтаў. На секцыях былі вызначаны найлепшыя выступы. Іх рэкамендавалі для напісання творчых работ, якія будуць удзельнічаць у II туры.

Другі тур — абласны: найлепшыя работы, прадстаўленыя на першым туры, былі накіраваны ў арганізацыйныя камітэты беларускіх ВНУ. Напрыклад, працы студэнтаў і навучэнцаў з Мінска — у БДУ, з Мінскай вобласці — у БДПУ імя М.Танка.

У аргкамітэт конкурсу па Мінску, які ўзначальвае прарэктар БДУ У.Л. Клюня, на II тур паступіла 155 творчых работ, сярод іх 91 работа студэнтаў БДУ. Найбольшую колькасць работ прадставілі студэнты факультэта міжнародных адносін (30), юрфака (15) і гістфака (10). Работы прысвячаюцца гістарычным, філасофскім, сацыялагічным, палітычным, эканамічным, краіназнаўчым і культуралагічным напрамкам даследавання тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны.

Для аналізу гэтых работ арганізацыйныя камітэты вызначылі экспертаў, рэцэнзентаў з ліку найлепшых выкладчыкаў і настаўнікаў гуманітарных дысцыплін. У гэтым годзе ў якасці экспертаў II тура выступаюць найлепшыя выкладчыкі гуманітарных факультэтаў БДУ, якія займаюцца тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны.

Правяраяцца работы будуць да 20 сакавіка. Па выніках экспертызы будуць зроблены пісьмовыя высновы. А пераможцаў вызначаць шляхам адкрытага галасавання члены арганізацыйнага камітэта.

Трэці тур конкурсу — рэспубліканскі. Для яго правядзення Савет спецыяльнага фонду створыць рэспубліканскі аргкамітэт, які з работ пераможцаў II тура выбярэ лепшыя. Вынікі III тура будуць падведзены 15 красавіка 2005 года.

Пераможцы конкурсу і іх навуковыя кіраўнікі будуць узнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі.

"Гэты конкурс праходзіць ужо чацвёрты год. Сёлета ён прысвечаны 60-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй. Прыемна, што ў гэтым годзе конкурс набыў асаблівую папулярнасць. Мы са здзіўленнем убачылі, што студэнты вельмі цікавяцца тэматыкай вайны. У іх свой, асаблівы погляд. Менавіта таму шмат вельмі цікавых, незвычайных работ. Па выніках конкурсу будзе выдадзены зборнік лепшых творчых работ", — адзначыў дэкан гістарычнага факультэта БДУ і член аргкамітэта конкурсу С.М. Ходзін.

**Юлія ПАПОВА**

**Ад рэдакцыі: Найлепшыя творчыя работы студэнтаў будуць адзначаны ў «Беларускім універсітэце».**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ВЫКЛАДЧЫК ПА ПРЫЗВАННІ**

Інтэрв'ю з прафесарам геаграфічнага факультэта Георгіем Якаўлевічам РЫЛЮКОМ з нагоды 70-гадовага юбілею



Стар. 3

**ГАНДАЛЬ ЖАНЧЫНАМІ: ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ПРАБЛЕМЫ**

"Круглы стол" на юрыдычным факультэце

Стар. 3

**НАШЫ ЛІЦЭІСТЫ — НАЙМАЦНЕЙШЫЯ!**

Прайшоў фінал XII чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па інтэлектуальных гульнях сярод школьнікаў

Стар. 4

Газета "Беларускі універсітэт" запрашае да супрацоўніцтва пазаштатных аўтараў. Калі Вы адчуваеце ў сабе творчыя памкненні, калі хочаце, каб пра падзеі на вашым факультэце даведаўся ўвесь універсітэт, — ПІШЫЦЕ НАМ!

Вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэл. 209-53-45 gazeta@bsu.by

## АБ'ЯВЫ

### АБАРОНА ДОКТАРСКІХ ДЫСЕРТАЦЫЙ

**29 сакавіка 2005 года ў 10.00 у аўд. 334 гал. корпуса адбудзецца абарона дысертацыі**

БЛАХІНА Андрэя Віктаравіча, дацэнта кафедры фізічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ, на тэму «Тэрмадынамічныя ўласцівасці і энергетычныя станы малекул у пластычных крышталях арганічных рэчываў» на суісканне вучонай ступені доктара хімічных навук.

**30 сакавіка 2005 года ў 15.00 у аўд. 334 галоўнага корпуса адбудзецца абарона дысертацыі**

МАЛЕВІЧ Юліяны Ігараўны, дацэнта кафедры міжнародных адносін БДУ, на тэму «Эвалюцыя канцэптуальных падыходаў да правоў чалавека ва ўмовах глабалізацыі» на суісканне вучонай ступені доктара палітычных навук.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (тэл. 209-51-68)**

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.17.06 (тэхналогія і перапрацоўка палімераў і кампазітаў).

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

**18 САКАВІКА** а шостай гадзіне вечара ў ліцэі БДУ адбудзецца фінал фестывалю эстрады БДУ—2005, прысвечаны 60-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гала-канцэрце прымуць удзел самыя таленавітыя прадстаўнікі факультэтаў, сярод якіх журы вылучыць пераможцаў у намінацыях "Танец", "Песня", "Музыка", "Размоўны жанр", "Арыгінальны жанр". Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

• • • • • • • • • • •

Пра вынікі універсітэцкай спартакіяды можна даведацца **24 САКАВІКА** на Свяце спорту, што адбудзецца ў ліцэі БДУ. У праграму свята ўваходзіць цікавы канцэрт і ўзнагароджанне пераможцаў.

• • • • • • • • • • • •

**26 САКАВІКА** ў 14.30 дзіцячы ансамбль танца "Літарынка" дае справаздачны канцэрт, каб пацвердзіць званне ўзорнага. Падтрымаць калектыў могуць усе зацікаўленыя. Уваход вольны. Месца дзеяння — Палац культуры МАЗа (Партызанскі праспект, 117-а).

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па справах культуры**

---

**2005 — ГОД ФІЗІКІ**

# УСЁ ДОБРАЕ І ДРЭННАЕ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ — АД ФІЗІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

джэнні прыродазнаўчых навук, у тым ліку і фізікі. Еўрапейскае фізічнае таварыства таксама абмяркоўвала праблему падняцця яе прэстыжу. Хаця на працягу апошніх гадоў пэўны інтарэс да фізікі праявіўся ў сувязі з нанаэлектронікай.

**— Які ўплыў мае фізіка на развіццё грамадства, на наша паўсядзённае жыццё?**

— Яна ўплывае на ўсе бакі нашага жыцця: можна сказаць, што ўсё добрае — ад фізікі, і ўсё дрэннае — ад яе ж. Можна прывесці некалькі прыкладаў: атамная і вадародная бомбы, камп'ютар, радыётэлефон, сотавы тэлефон, тэлевізар, спадарожнікі...

Фізікі і хімікі заўсёды працавалі на абарону. Успомнім, напрыклад, гісторыю стварэння алюмінію. Напалеон хацеў зрабіць лёгкія даспехі для сваіх салдат. Ён выдзеліў фінансаванне навукоўцам, і таму людзі атрымалі алюміній, без якога сучаснаму чалавеку ніяк не абысціся: ён і ў авіяцыі, і ў касманаўтыцы, і ў ваеннай тэхніцы.

Камп'ютары з'явіліся ў выніку распрацоўкі атамнай бомбы: каб рабіць вялікую колькасць вылічэнняў, стварылі вылічальную машыну. Паступова гэтыя машыны ўдасканальваліся. І так з'явіліся сучасныя камп'ютары. У тым ліку і беларускі "Скіф"...

Фізіка дэмакратызавала мастацтва: 200 гадоў таму, каб паслухаць музычны твор, трэба было ў пэўны час з'явіцца ў пэўным месцы, дзе гэты твор будуць выконваць. Пасля вынаходніцтва радыё Марконі і Паповым ужо не трэба было вызначанае месца, а толькі час. А як вынайшлі магнітафон, лазерны дыск, ужо не трэба ні канкрэтнае месца, ні дакладны час, каб паслухаць тое, што табе хочацца. Дэмакратычна? Так!

**— Наколькі нашыя беларускія навукоўцы рухаюцца ў рэчышчы тэндэнцый развіцця фізічнай навукі ў свеце?**

— Беларускія навукоўцы не могуць працаваць у адрыве ад навукоўцаў усяго свету. І ўсе нашыя дасягненні ідуць у рэчышчы сусветнага развіцця навукі. Хаця ў нас даволі цяжкое эканамічнае становішча: не хапае абсталявання, матэрыяльных рэсурсаў, — але поспехі беларускіх навукоўцаў, напрыклад у галіне лазернай фізікі, сапраўды ўражваюць.

У Беларусі традыцыйна былі развіцця дзве галіны фізікі — аптычны кірунак, аснову якога заклалі А.Н. Сеўчанка і Б.І. Сцяпанаў, і матэрыялазнаўчы кірунак. Гэта добра стасуецца з прамысловасцю Беларусі, якая фарміравалася яшчэ ў савецкія часы. У краіне актыўна развівалася машынабудаванне, оптыка, электроніка. Гэтыя напрамкі моцныя ў Беларусі і сёння. Апошнім часам вельмі добра ў краіне і ў БДУ (у тым ліку і на нашым факультэце) ідзе развіццё біялагічных навук. XXI стагоддзе лічыцца эпохай біялогіі, таму біяфізіка — навука паміж фізікай і біялогіяй — мае вялікія перспектывы. У нас ёсць кафедра біяфізікі, якая мае, на мой погляд, значныя дасягненні, і акрамя чыстай навукі іх можна ўжо выкарыстоўваць на практыцы.

**— У якіх сумесных міжнародных навуковых праектах паспяхова ўдзельнічаюць беларускія навукоўцы?**

— Фізікі з нашага універсітэта актыўна працуюць з расійскімі калегамі з Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (г.Дубна). Праз іх мы паспяхова ўзаемадзейнічаем з фізікамі з Еўрапейскай лабараторыі фізікі часціц у ЦЕРНе. Беларусь удзельнічае ў некалькіх прэктах ("Атлас", CMS), над якімі працуе шмат навукоўцаў з розных краін. Усе гэтыя праекты — частка глабальнага міжнароднага навуковага праекта па мадэрнізацыі вялікага паскаральніка.

Паскаральнік — гэта тунэль на глыбіні прыкладна 15—16 м, які знаходзіцца на тэрыторыі двух краін (Швейцарыі і Францыі). Там створаны звышвысокі вакуум, дзе рухаюцца паскораныя часціцы. Іх ганяюць па кругу, і калі яны ўзаемадзейнічаюць з рэчывам (ці адна з адной), адбываецца перадача энергіі. Можна сказаць, што гэта фізіка часціц высокіх энергій. Мадэлюючы тыя працэсы, якія маглі адбывацца пры Вялікім Выбуху, у выніку чаго стварыўся Сусвет... Вучоныя спадзяюцца, што гэта дапаможа наблізіцца да разгадкі стварэння Сусвету, дасць новае ўяўленне пра сучасную фізічную карціну свету.

Беларусь вельмі годна глядзіцца ў гэтым праекце. Напрыклад, рэчывы для спектрометраў, якія стварылі ў Інстытуце ядзерных праблем БДУ, выбраныя навукоўцамі ЦЕРНа як асноўныя.

Універсітэцкія фізікі актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных праектах па праграмах INTAS, MNTC, KOPERNIKUS і інш. З кожным годам больш складана выйграваць конкурс на ўдзел у гэтых праектах, таму што канкурэнцыя расце, але ў нас гэта атрымліваецца.

**— А як фізіка паўплывала на Ваша жыццё? Чым Вас яна прывабліваe?**

— Ведаеце, чым мне падабалася фізіка? Мой дзядзька быў вясковым настаўнікам. І чым ён мяне зацікавіў?.. Ёсць такое паняцце ў фізіцы — пашырэнне пары. Ён зрабіў эксперымент. Узяў металічную гільзу ад патрона, наліў туды вады, закупорыў і пачаў церці гэтую гільзу шнурком. Праз нейкі час у працэсе трэння гэтая гільза разагрэлася — і корак вылецеў. На той час мне было гадоў пяць, і гэта мяне вельмі ўразіла. Таму я і пачаў цікавіцца фізікай.

У школе мне падабаліся фізіка і матэматыка. Куды паступаць вучыцца, мне тады было абыякава, але галоўнае, каб гэта было звязана з тэхнічным кірункам. Памятаю, у 1962 г. прыйшоў у Політэхнічны інстытут здаваць дакументы. Мяне там сустрэлі не вельмі ветліва. Быў канец дня, і нейкая цётка сказала: заўтра прыйдзеце! Тады я пайшоў у БДУ, дзе мяне сустрэла прыгожая ветлівая дзяўчына. І я аддаў дакументы для паступлення на фізічны факультэт. Але першы год мне не пашанцавала: не хапіла паўбала для паступлення на дзённае аддзяленне — і я трапіў на вячэрняе. Два гады працаваў на заводзе і вучыўся. Пасля перавёўся на дзённае. Закончыў фізічны факультэт, паступіў у аспірантуру, і далей — асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар...

Ад 1962 г. я ў БДУ. І зусім пра гэта не шкадую! Калі б давялося пачынаць ізноў — пайшоў бы ў БДУ. І менавіта на фізічны факультэт. Тут нейкая своеасаблівая атмасфера, дэмакратычныя ўзаемаадносіны паміж выкладчыкамі і студэнтамі. У нас на факультэце вучаць думаць.

**— Якія Вашы навуковыя інтарэсы?**

— Цяпер мае навуковыя інтарэсы — узаемадзеянне пучкоў зараджаных часціц з матэрыяламі, гэта радыяцыйная фізіка цвёрдага цела. Ва ўсім свеце гэты напрамак матэрыялазнаўства актыўна развіваецца. Калі апраменіць пучком іонаў матэрыял, то ўласцівасці гэтага матэрыялу вельмі моцна змяняюцца. Напрыклад, калі жалеза апраменіць вугляродам, то на яго паверхні з'яўляецца слой сталі — гэта робіць матэрыял больш танным. Калі ж мы возьмем для апраменьвання іншыя іоны, напрыклад, вальфрам, малібдэн, атрымаем вельмі дарагую інструментальную сталь. І не трэба для гэтага вялікай колькасці малібдэну і вальфраму!..

Апошнім часам пачаў займацца вугляродам, яго злучэннямі, асабліва фулерэнамі. Мяне таксама цікавяць нанатрубкі. "Нана" — гэта памер, меншы за 10 у мінус дзевятай ступені метра. І на сённяшні дзень гэта вельмі актуальна, бо ў свеце ідзе далейшая мініяцюрызацыя электронікі. Раней былі лямпы, пасля — транзістары, пасля — мікрасхемы, дзе можна было размясціць сотні і тысячы транзістараў. А цяпер ідзе пераход на нанаўзровень, з мікраэлектронікі — на нанаэлектроніку. Нанатрубкі, нанапамерныя ўтварэнні вугляроду актуальныя і ў біялогіі, і ў медыцыне, і ў тэхніцы. Гэта матэрыял будучыні!

Пакуль ва ўсім свеце ідуць пераважна даследаванні ў гэтым кірунку, і развітыя краіны выдаткоўваюць у нанаэлектроніку мільярды долараў, бо за гэтым будучыня.

**— Якая, на Вашу думку, роля фізічнага факультэта БДУ ў развіцці ўсёй фізічнай навукі ў нашай краіне?**

— Усе інстытуты фізічнага профілю ў нашай краіне прыкладна на 85 % укамплектаваны выпускнікамі фізічнага факультэта нашага універсітэта. І цяперашняе кіраўніцтва гэтых інстытутаў — таксама нашы выпускнікі. Тут роля фізічнага факультэта відавочная. Мы падтрымліваем шчыльныя сувязі з усімі фізічнымі інстытутамі краіны. Нашыя студэнты выконваюць курсавыя, дыпломныя працы ў гэтых інстытутах. Кожны год у акадэмічныя інстытуты ў аспірантуру мы накіроўваем 20—30 чалавек. Ва ўсе часы на нашым факультэце было дзяржаўнае размеркаванне фізічнікаў. І заўсёды запытаў на нашых спецыялістаў было больш, чым мы маглі прапанаваць.





**Таццяна КАЗАК,**
**Фотаздымкі Сняжаны ЛІСОЎСКАЙ**

**19 сакавіка Віктару Міхайлавічу Анішчыку спаўняецца 60 гадоў. Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» і клуб сяброў газеты віншуюць юбіляра. Жадаем моцнага здароўя і поспехаў у навуковай дзейнасці! Спадзяемся на далейшае супрацоўніцтва.**

ЮБІЛЕІ

# ВЫКЛАДЧЫК ПА ПРЫЗВАННІ

*Ці існуе вечны рухавік? Вечны рухавік — гэта чалавек, які і ў сталым узросце адчувае сябе маладым, у якога вочы свецяцца юнацкім запалам. Не верыце? Тады заходзьце на геаграфічны факультэт і спытайце Георгія Якаўлевіча РЫЛЮКА.*

*У гэтым годзе наш выкладчык адзначае 70-гадовы юбілей. Да гэтай даты ён падышоў з вялікім багажом накопленых ведаў, прафесійнага вопыту.*

*Мы хваляваліся, калі ішлі на інтэрв'ю да такога унікальнага выкладчыка, але ён аказаўся простым і сціплым чалавекам, з якім вельмі прыемна размаўляць.*

**Георгій Якаўлевіч нарадзіўся 6 сакавіка 1935 г. у вёсцы Пікачы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1958 годзе паступіў на геаграфічны факультэт БДУ, які скончыў у 1963 г. З 1962 па 1966 г. быў сакратаром камітэта камсамола універсітэта. З 1966 г. працаваў на геаграфічным факультэце на пасадзе старшага выкладчыка. У 1968 г. паступіў у завочную аспірантуру БДУ, а ў студзені 1974 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1969 па 1974 г. — намеснік сакратара парткама БДУ. З 1976 г. ён працуе дацэнтам на кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі. А ў верасні 2004 г. стаў прафесарам гэтай жа кафедры.**

**— Якія Вашыя мары здзейсніліся?**

— Канешне, я марыў, але многае не здзейснілася. Я марыў і паступіў ва універсітэт, аспірантуру, абараніў дысертацыю і стаў выкладчыкам. Адсюль і праца сакратаром парткама: каб стаць выкладчыкам у тыя часы, трэба было прайсці партыйную школу. Кіраваўся прынцыпамі таго часу: каб дасягнуць пэўных вяршынь, трэба было выконваць грамадскую працу. Мяне называлі пестуном лёсу, але я дамагаўся ўсяго сваёй працай. Цяпер разумею, што многія магчымасці, якія мне давала жыццё, я не рэалізаваў.

**— Ці стаялі Вы перад выбарам: геаграфічны факультэт альбо іншае месца работы?**

— Ніколі пра гэта не думаў. Выкладчык можа называць сябе выкладчыкам, калі ён любіць студэнтаў, любіць тое, што ён чытае. Я прыйшоў па прызванні і іншага жыцця не прызнаю.

**— Чым адрозніваюцца сучасныя студэнты ад студэнтаў таго часу?**

— Раней я вылучаў студэнтаў дзвюх катэгорый: лепшыя і добрыя. Цяпер з'явілася новая катэгорыя — суперстудэнты. Маладыя, адукаваныя, яны валодаюць камп'ютарам і замежнымі мовамі, імкнуцца да новага. Шмат выхаваных. І раней былі выхаваныя людзі, але тады было не столькі выхаванне, колькі пачуццё, звязанае са страхам. Сучасныя студэнты бачаць выкладчыка глыбей, бо разумеюць, што гэта звязана з вялікай працай. Са з'яўленнем новых магчымасцяў студэнты больш асэнсавана і годна сябе паводзяць. На розум прыходзіць выслоўе: "З узрастаючымі мэтамі чалавек узрастае".

**За шматгадовую работу па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай адукацыі ў Беларусі Г.Я. Рылюк узнагароджаны граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Незвычайны педагог, чалавек найбагацейшай культуры і найглыбейшых ведаў... Азначэнні ў найвышэйшай ступені прымяняць у гэтым выпадку можна бясконца.**

**— Як Вы сябе адчуваеце ў студэнцкім асяродку?**

— Люблю размаўляць са студэнтамі. Жыву іх інтарэсамі, застаючыся маладым. Я вучу і вучуся ў вас. Мая місія: набытыя мною веды і вопыт павінны быць запатрабаваны. Я павінен падзяліцца імі. Мяняцца разам са студэнтамі, далучацца да іх — гэта патрабаванне часу.

**— Ці верыце Вы, што ўсё, што ні робіцца, — да лепшага?**

— Гэта і ёсць мудрасць жыцця. Непрыемнасці падбадзёрваюць і вымушаюць чалавека рухацца наперад.

**— Якое месца Вам даражэй за ўсё на свеце?**

— Пабываўшы ў 14 краінах свету, я па-сапраўднаму палюбіў Парыж. Ён цудоўны, свабодны. Людзі вельмі выхаваныя і не дазваляюць сабе вольнасцяў. Хацелася там застацца, але ўжо праз некалькі дзён я пачынаў сумаваць па Радзіме, думаў, як буду дзяліцца ўражаннямі са студэнтамі.

**— Ці былі ў Вашым жыцці куміры?**

— Я куміры разбураю. Я арыентуюся на чалавека вышэйшай культуры, адукаванасці, прафесіяналізму. Я ўдзячны сваім настаўнікам і выкладчыкам, таму часу і той школе за тое, што не толькі далі мне веды, але і навучылі вучыцца.



**— Што Вы параіце маладому чалавеку, у якога ўсё жыццё наперадзе?**

— Выбраць у жыцці прыярытэты. Служыць сваёй мэце. Падбіраць сабе акружэнне. Як сцвярджае кангалезская прыказка, калі ты сустрэнеш на сваім шляху чалавека, які ведае, чаго хоча, ідзі за ім, і ты дасягнеш поспеху.

Будзь адукаваным. Я заўсёды пачынаю сваю лекцыю такімі словамі: "Паступіўшы ва універсітэт, не думайце, што вы зможаце ўзяць усё. Вы зможаце ўзяць роўна столькі, колькі самі захочаце".

Паважайце навакольных. На сваіх лекцыях я вучу студэнтаў у першую чаргу жыццю.

**Г.Я. Рылюк — аўтар больш за сто навуковых публікацый. Ён суаўтар падручніка па геаграфіі для 7-га класа сярэдняй школы. Асноўнымі яго манаграфіямі з'яўляюцца "Вытокі геаграфічных назваў Беларусі з асновамі агульнай тапанімікі", "У свеце геаграфічных назваў паўднёвых мацерыкоў", "У свеце геаграфічных назваў мацерыкоў паўночнага паўшар'я", "Фізічная геаграфія мацерыкоў і акіянаў". Г.Я. Рылюк з'яўляецца аўтарам 11 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, ён прадаўжальнік навуковых даследаванняў па тапаніміцы Беларусі. З 1970 г. па 1980 г. выступаў на тэлебачанні, дзе вёў урокі па геаграфіі мацерыкоў для сярэдняй школы.**

**Дзякуючы такім прынцыпам Георгій Якаўлевіч выхаваў многія пакаленні студэнтаў. Мы, ад імя ўсіх студэнтаў, якія калі-небудзь вучыліся на геаграфічным факультэце, дзякуем лёсу за тое, што даў магчымасць быць знаёмымі і вучыцца ў такога разнастайна таленавітага чалавека, Выкладчыка з вялікай літары. Віншуем Вас, Георгій Якаўлевіч, з юбілеем! Жадаем Вам шматгадовай працы на факультэце, удзячных студэнтаў, плённай навуковай дзейнасці і здзяйснення ўсіх мараў.**

**Людміла ГРЭСЬ,**
**Юлія БОГДАН, студэнткі геаграфічнага факультэта**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ГАНДАЛЬ ЖАНЧЫНАМІ: ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ПРАБЛЕМЫ

*Гэта важная праблема стала тэмай для абмеркавання на "круглым стале", арганізаваным студэнтамі юрыдычнага факультэта, які адбыўся 10 сакавіка.*

Актыўны ўдзел у правядзенні мерапрыемства прынялі студэнты, выкладчыкі кафедраў канстытуцыйнага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага права С.А. Калінін, Н.М. Кандратовіч, В.В. Марчук, Т.У. Навумовіч, А.В. Шаўцова, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце У.М. Сатолін, намеснік дэкана па навуковай рабоце Г.А. Шумак, старшыня Савета па навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў і аспірантаў юрыдычнага факультэта В.У. Часаліна, старшыня прафсаюзнай арганізацыі юрыдычнага факультэта, загадчык музея правазнаўства Л.П. Максімава, прадстаўнікі дзяржаўных органаў.

Запрошаны на "круглы стол" першы намеснік начальніка ўпраўлення па супрацьдзеянні незаконнаму абарачэнню наркотыкаў і злачынствам у сферы нораваў МУС Рэспублікі Беларусь М.М. Луканаў адзначыў, што даходы ад гандлю людзьмі паспяхова канкурыруюць у свеце з даходамі ад гандлю зброяй і наркотыкамі. Ён прывёў адпаведныя лічбы, якія даюць падставы меркаваць, што з Беларусі ажыццяўляецца вываз жанчын больш чым у 30 краін свету для працы ў сферы секс-паслуг. Кіраўніцтва нашай дзяржавы ацэньвае гэта як пагрозу нацыянальнай бяспецы, а барацьба з гэтай з'явай вызначана ў якасці прыярытэтнага напрамку дзейнасці праваахоўных органаў. Выступовец расказаў пра канкрэтныя меры, якія робяцца названымі органамі, і пазітыўныя зрухі, дасягнутыя ў выніку рэалізацыі ўсяго комплексу мер па процідзеянні гандлю людзьмі.

Загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар Р.А. Васілевіч падкрэсліў у сваім выступе, што наша дзяржава не можа заставацца ўбаку ад гэтай праблемы, бо згодна з артыкулам 10 Канстытуцыі грамадзяніну Рэспублікі Беларусь гарантуецца абарона і заступніцтва дзяржавы як на тэрыторыі краіны, так і за яе межамі. Ён падкрэсліў неабходнасць не толькі далейшага ўдасканалення заканадаўства ў гэтым напрамку, але і прыняцця шэрага іншых мер. Інакш падыход да вырашэння гэтай комплекснай праблемы, паводле яго вобразнага параўнання, быў бы не знішчэннем яе на карані, а лёгкай "стрыжкай газону".

Студэнты факультэта А. Падрубная, Я. Ганковіч, В. Балашчанка, Ю. Валынец, Г. Бараноўская, І. Асвяцімская і інш. падчас ажыўленага абмеркавання праблемы закранaлі пытанні асаблівасцей яе прававога рэгулявання на ўзроўні міжнародных актаў, замежнага і беларускага заканадаўства.

Дацэнт кафедры крымінальнага права, кандыдат юрыдычных навук В.В. Марчук на высокім прафесійным узроўні зрабіў параўнальны аналіз нормаў міжнародна-прававых дакументаў і нацыянальнага заканадаўства, у тым ліку Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2005 г. №3 «Аб некаторых мерах па процідзеянні гандлю людзьмі».

У выступе дацэнта кафедры канстытуцыйнага права, кандыдата юрыдычных навук А.В. Шаўцовай адзначалася сувязь гандлю жанчынамі з такімі глабальнымі праблемамі, як нелегальная міграцыя і гендэрныя праблемы. Падкрэслівалася, што заканадаўства не заўсёды мае рэсурсы для рэальнага ўвасаблення прадугледжаных мер, але гэта не азначае, што гэтай з'яве нельга процістаяць з дапамогай арганізацыйных мер.

Дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юрыдычных навук С.А. Калінін закрануў светапоглядны аспект, выказаўшы меркаванне пра мэтазгоднасць уздзеяння на асобу, асабліва ў перыяд фарміравання і развіцця яе свядомасці, шляхам сцвярджэння пазітыўных прыкладаў.

Падводзячы вынікі "круглага стала", яго ўдзельнікі падкрэслівалі неабходнасць ажыццяўлення сістэмнай работы дзяржаўных органаў, у тым ліку з дапамогай прававых сродкаў, па прадухіленні і распаўсюджванні такой небяспечнай з'явы, як гандаль людзьмі, асабліва жанчынамі і дзецьмі, абароны жыцця, здароўя, свабоды і іншых канстытуцыйных правоў грамадзян.

**Ганна БАРАНОЎСКАЯ,**
**Міхаіл ЧЫКІЛЁЎ,**
**студэнты юрыдычнага факультэта**

АКТУАЛЬНА

## АЛІМПІЯДЫ БДУ

Скончыўся першы (завочны) тур алімпяд "Абітурыент БДУ — 2005". Удзел у ім прынялі 2639 чалавек: з Мінска — 1138, з іншых гарадоў — 1143, з сельскіх населеных пунктаў — 358 чалавек. У другі тур, які адбудзецца 20 сакавіка на факультэтах БДУ, выйшлі 1720 удзельнікаў. Трэці, заключны тур алімпяды прызначаны на 10 красавіка.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## ДНІ ГЕОГРАФА

*З 21 па 26 сакавіка ва універсітэце пройдуць Дні географа.*

22 сакавіка ў чытальнай зале геаграфічнага факультэта адбудзецца прэзентацыя рэдкіх кніг XVIII—XIX стст. Беларускага геаграфічнага таварыства, перададзеных у фонд бібліятэкі.

На выставе "Геаграфічнае пазнанне свету" будуць прадстаўлены падарожныя дзённікі, запіскі знакамітых падарожнікаў, навукоўцаў. Сярод іх санкт-пецярбургскія выданні "Запіскі імператарскага геаграфічнага таварыства" ў 5 тамах (1875 г.), "Геаграфічны статыстычны слоўнік Расійскай імперыі" (складальнік П. Сямёнаў, 1867 г.), "Цэнтральная Азія, Паўночны Кітай і Нань-Шань. Справаздача аб падарожжах" (1901 г.) і інш.

Кнігі змяшчаюць багаты гісторыка-этнаграфічны матэрыял аб разнастайных краях свету — Тыбеце, Сярэдняй Азіі, Манголіі, Цянь-Шані і г.д.

*Тэл. для даведак: 209-54-58.*

**Аддзел гуманітарна-асветніцкай работы ФБ БДУ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

***

**17 САКАВІКА** ў канферэнц-зале інтэрната № 2 адбудзецца гарадскі семінар па пытаннях арганізацыі другаснай занятасці моладзі "Студэнцкае лета".

***

Літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне" запрашае **17 САКАВІКА** на творчы вечар з удзелам паэта Міколы Аўрамчыка, прысвечаны 60-годдзю Перамогі, (канферэнц-зала інтэрната № 2, пачатак у 19 гадзін).

***

**23 САКАВІКА** адбудзецца чарговае пасяджэнне клуба "Студэнцкая сям'я — XXI стагоддзе (канферэнц-зала інтэрната № 2, пачатак у 19 гадзін).

***

**24 САКАВІКА** пройдзе традыцыйны конкурс студэнцкага гарадка "А ну-ка, дзяўчаты!", у якім прымуць удзел 9 прадстаўніц — з кожнага інтэрната БДУ. Конкурс адбудзецца ў сталовай інтэрната № 5 (вул. Кастрычніцкая, 4), пачатак у 19 гадзін.

***

**21—31 САКАВІКА** ў інтэрнатах БДУ адбудуцца справаздачна-выбарныя канферэнцыі студсаветаў інтэрнатаў.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Е.А. Кривонос.* **Орфография и пунктуация русского языка (в таблицах).** У выданні ўсе арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы даюцца ў выглядзе табліц з прыкладамі, што спрыяе хуткаму засваенню матэрыялу. Кніга прызначаецца для падрыхтоўкі абітурыентаў да экзаменаў па рускай мове.

*В.И. Дунай, А.Н. Антоненко, Г.Н. Семенкова.* **Дыхательная система человека.** У дапаможніку, прызначаным для студэнтаў I, II курсаў хімічнага факультэта ("фармацэўтычная дзейнасць"), падаюцца звесткі па анатоміі і фізіялогіі дыхальнай сістэмы чалавека, а таксама матэрыял для выканання лабараторных работ.

*В.А. Коледа.* **Физическая культура в формировании личности студента.** У манаграфіі разглядаюцца асноўныя напрамкі фізкультурна-




спартыўнай дзейнасці студэнта: праграмны матэрыял, адносіны, матывацыя, узровень фізічнага здароўя, прафесійная гатоўнасць, інтэгратыўнасць і этапнасць.

*В.П. Семенченко.* **Консументы и их роль в экосистемах.** У курсе лекцый выкладаюцца асноўныя палажэнні, якія датычацца розных класіфікацый кансументаў, іх колькасных і якасных сувязей з крыніцамі ежы і эфектыўнасці яе выкарыстання, узаемадзеяння кансументаў між сабой.

*М.Г. Лукашевич.* **Введение в магнитоэлектронику.** У курсе лекцый разглядаюцца пытанні пераносу зараду ў немагнітных і магнітнаўпарадкаваных кандэнсаваных асяроддзях і структурах на іх аснове ў знешнім магнітным полі, магчымасць прымянення магнітнарэзістыўных эфектаў у прыстасаваннях аўтаматыкі, вымяральнай і вылічальнай тэхнікі.

**Польская і чэшская паэзія памежжа XIX—XX стагоддзяў.** *Аўтары-складальнікі А.У. Вострыкава, М.М. Хмяльніцкі.* Выданне змяшчае метадычныя рэкамендацыі, уводзіны да тэм, тэматыку рэфератаў і курсавых работ, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры па гісторыі польскай і чэшскай паэзіі памежжа XIX—XX стст.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

ВІНШУЕМ!

## НАШЫ ЛІЦЭІСТЫ — НАЙМАЦНЕЙШЫЯ!

*4—6 сакавіка ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (НЦМТДМ) адбыўся фінал XII чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па інтэлектуальных гульнях сярод школьнікаў.*

Камандам-удзельніцам давялося прайсці жорсткі адборачны этап — агульнарэспубліканскі сінхронны тур, у якім удзельнічалі 257 каманд з усёй краіны. З іх былі адабраны 37 найлепшых (з Брэста, Віцебска, Гомеля, Светлагорска, Мазыра, Гродна, Ліды, Любані, Вілейкі, Магілёва і Мінска), якія і змагаліся за званне чэмпіёнаў краіны ў гульнях "Што? Дзе? Калі?" і "Брэйн-рынг". Арганізавалі турнір Міністэрства адукацыі, НЦМТДМ і грамадскае аб'яднанне "Беларуская ліга інтэлектуальных каманд".

Каманды-пераможцы атрымалі медалі і памятныя падарункі. Існаваў нават спецыяльны прыз ад ганаровага госця — знакамітага Алеся Мухіна: летняя паездка ў лагер юных "знаўцаў" у Калінінградзе (уладальнікам яго стала мінская каманда "Фееерыя").

Пераможцам у абедзвюх гульнях стала каманда ліцэя БДУ "Дурол": Міхаіл Барэль (капітан), Іван Тапчый, Таццяна Лопух, Паліна Доўнар, Кірыла Сінкевіч, Андрэй Сыман. Дагэтуль сітуацыя, калі каманда займала абодва першыя месцы, здаралася толькі аднойчы — 10 гадоў таму. Дарэчы, на чэмпіянаце Беларусі летась "Дурол" таксама быў наймацнейшым у гульні "Брэйн-рынг", а ў "Што? Дзе? Калі?" заняў III месца. Поспехаў камандзе дамагаецца не толькі ў інтэлектуальных гульнях: у ёй ёсць удзельнікі і пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіяд.

Трэнер "Дурола" Сцяпан Цемушаў нават не чакаў ад каманды такой бліскучай гульні: "Яны вартыя гэтай перамогі, бо каштавала яна вельмі вялікіх намаганняў". Сцяпан Мікалаевіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ. Два гады запар (у 2003 г. і 2004 г.) атрымліваў тытул найлепшага трэнера Беларусі. Ці атрымае ён ганаровы тытул у гэтым сезоне? Час пакажа: наперадзе яшчэ Кубак Еўропы, куды трапляюць толькі мацнейшыя з мацнейшых і дзе барацьба за перамогу будзе яшчэ больш жорсткай. А пакуль пажадаем камандзе "Дурол" новых поспехаў!

**Алена ШЫБУТ**

ПОСТФАКТУМ

## СВЯТА ВЯСНЫ

Святочная праграма "Прыгажосць. Здароўе. Поспех", прысвечаная 8 Сакавіка, адбылася ў памяшканні філалагічнага факультэта. На выставе-продажы былі прадстаўлены тавары фабрык галаўных убораў "Людміла" і галантарэі "Галантэя". Падрабязна пазнаёміцца з асартыментам тавараў можна было і на паказе мадэляў, арганізаваным студэнткамі педкаледжа лёгкай прамысловасці.

Пра спосабы захаваць здароўе і прыгажосць распавялі кансультанты фірмы "Здаровае харчаванне" і медыцынскага цэнтра "Тэра-Медыка і К". Стаць прыгажэйшымі жанчыны могуць і ў любы іншы час: для тых, хто ўваходзіць у Саюз жанчын БДУ, у цэнтры дзейнічае скідка — 5 %.

Для тых, хто клапоціцца пра агульны стан арганізма, працавалі кансультанты фірмы "Альтэра-Холдынг": яны распавялі аб правільным харчаванні, прапанавалі разнастайныя тэрапеўтычныя сродкі, натуральную і дэкаратыўную касметыку. Паралельна з працай кансультантаў у актавай зале адбываўся святочны канцэрт.

**Вольга КІСЯЛЁВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі**

У ПРАФКАМЕ

## СТУДЭНТЫ АДПАЧЫВАЮЦЬ У "БРЫГАНЦІНЕ"

*Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ пасля зімняй сесіі арганізавала адпачынак для студэнтаў, выдаткаваўшы на гэта каля 6 млн рублёў.*

"Брыганціна" — аздараўленчы лагер БДУ, цудоўнае месца адпачынку. Каб больш даведацца пра ролю спартыўна-аздараўленчага комплекса "Брыганціна" ў студэнцкім адпачынку, мы сустрэліся з Настассяй Кацэвіч і Іванам Іванейчыкам — студэнтамі механіка-матэматычнага факультэта. Настасся — намеснік старшыні прафбюро факультэта, Іван — старшыня жыллёва-бытавой камісіі.

**— Як можна трапіць у "Брыганціну"?**

**І.:** Каб атрымаць пуцёўку, трэба напісаць заяву, заплаціць 15.000 рублёў (што складае 60 % ад кошту пуцёўкі, астатняе аплачвае прафсаюз), дабавіць 10.600 за праезд у абодва бакі… і смела ехаць у лагер.

**— Што самае запамінальнае ў лагеры падчас адпачынку?**

**І:** Вядома, забаўляльныя "заняткі". У нас праходзяць вечарыны бардаўскай песні, інтэлектуальныя гульні, спартыўныя спаборніцтвы, паказы фільмаў.

**Н.:** Акрамя гэтага, у "Брыганціне" можна паўдзельнічаць у канцэртнай праграме, патанчыць на вячэрняй ці начной дыскатэцы, заняцца спортам, напрыклад, лыжамі або плаваннем…

**І.:** …І, канечне ж, паправіць здароўе.

**Алена КРЫЎКІНА**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

## ЗНАЁМЦЕСЯ: "БІЯТЭАТР"

*— Без нашага кіраўніка нічога не скажам, — у адзін голас адгукнуліся артысты "Біятэатра" з біялагічнага факультэта БДУ.*

*— А мо вы мяне баіцеся?— жартам запыталася я.*

*Адказу не было.*

*Але ж усё атрымалася прасцей. Бацька "Біятэатра" Аляксандр Георгіевіч Песнякевіч здаўся мне цікавым, шчырым на пахвалу да сваіх "дзетак" і ў той жа час цвёрдым кіраўніком. Ён з ахвотай расказаў аб тэатральным жыцці на біяфаку.*

**Частка 1. МЕМУАРЫ**

1970 год, СССР (цяпер ужо былы). Пасля заканчэння біяфака БДУ малады Аляксандр застаецца працаваць у яго лабараторыі. Мяркуючы, што ён яшчэ не забыў свайго студэнцтва, актыўнага супрацоўніка абралі ў прафсаюзнае бюро для працы з моладдзю. Прапанавалі рыхтаваць розныя святы. Вядома, на той час усе мерапрыемствы чамусьці рабіліся аднолькавымі, як браткі-блізняты. Сама сабой нарадзілася думка: "Трэба праводзіць святы больш неафіцыйна, інакш будзе нецікава".

Першы крок — адразу пародыя. У 1976 годзе артысты не пабаяліся паставіць "карыкатуру" на пасяджэнні шматлікіх саветаў. Даклады ў членаў прэзідыума былі сапраўдныя, злабадзённыя. Здаецца ж, тэма "наскальных" (або "напартных") надпісаў заўжды была ў модзе?..

Студэнты — самы рызыкоўны народ. Так, праз хуткі час "Біятэатр" ужо выступаў з операй "Ванька Жукаў — Super Star". Ці здагадаліся, пра што яна? Толькі Жукаў-Хрыстос у іх не памёр, а працягваў жыць і нават сустракацца з Марыяй Магдаленай.

**"ВЕЧНЫ БІЛЕТ" "Біятэатра" — не з роду "вушастых", віду "зайцавых": за яго не штрафуюць. Наадварот, ён даецца кожнаму выпускніку суполкі, каб ён заўжды мог прыйсці на сустрэчу. Нават праз 30 год.**

**Частка 2. НАШЫ "ФІШКІ"**

Па-першае, тэатральная вечарына заўжды робіцца ў форме капусніка. Марудна распрацоўваецца ідэя, хутка знікаюць навабранцы, усё дапрацоўваецца да самага апошняга дня. Знаёма?

Па-другое, пастаноўкі разлічана на сваё кола гледачоў. Менавіта на тых, хто звяртае ўвагу на змест, а не на форму. Найперш гэта самі біёлагі. Не можа "Біятэатр" забыцца на свой факультэт, на яго вылькічаюцца выкладчыкаў і агульную спецыяльнасць.

І па-трэцяе, большасць герояў Аляксандра Георгіевіча — рэчы. Жывыя рэчы, якія маюць нейкі характар, свае думкі і не саромеюцца іх выказваць.

**Частка 3. РЭАЛІІ**

Выраз "фінансы пяюць рамансы" вядомы многім. Няма грошай — няма залы і сцэны для сустрэч. Раней нейкія сродкі "Біятэатр" атрымліваў ад продажу білетаў (але цэны ў краіне растуць, а стыпендыя ў студэнтаў, сярод якіх білеты распаўсюджваліся, — не настолькі хутка). Нечым час ад часу дапамагалі былыя ўдзельнікі альбо дэканат факультэта. З цяжкасцю, але грошы знаходзяцца. Усё ж рамансы мы чуем часцей, чым грашовую цішыню.

Хуткі бег часу: сесія (адна, другая), адаптацыя пасля канікул, залікі, узімку і ўвосень — шматлікія хваробы. Вось і атрымлівецца толькі 2 выступленні за год (першае — на Дзень першакурсніка, другое — Дзень біёлага). А раней атрымлівалася і па 5. Ці не варта паспрабаваць так зноў?

**Алена КРЫЎКІНА**

ВЫСТАВЫ

**17—26 САКАВІКА** ў чытальнай зале для прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў (прасп. Ф. Скарыны, 4, гал. корпус, 2-і паверх) дзейнічае выстава навуковых прац прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук, загадчыка кафедры ядзернай фізікі Віталя Яўгенавіча Ямнага, прымеркаваная да 65-годдзя з дня нараджэння.

***

На працягу ўсяго сакавіка ў студэнцкай чытальнай зале літаратуры па прыродазнаўчых навуках (прасп. Ф. Скарыны, 4, гал. корпус, 3-і паверх) працуе выстава "Прарок у сваёй айчыне", прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння Ж.І. Алфёрава.

***

**29 САКАВІКА — 25 КРАСАВІКА** на геаграфічным факультэце (вул. Ленінградская, 16) можна пазнаёміцца з выставай "Геалогія і сучаснасць".

***

Да канца сакавіка ў аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі (прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2-і паверх) працуюць тры выставы: "Працы рускага навукоўца А.К. Джывілегава, выдадзеныя на пачатку XX стагоддзя" (да 130-годдзя з дня нараджэння навукоўца), "Найлепшыя выданні кніг вядомага французскага географа і сацыёлага Ж.Э. Рэклю ў фондах ФБ БДУ" (да 175-годдзя з дня нараджэння) і "Я.А. Баратынскі і яго час" (да 205-годдзя з дня нараджэння паэта).

***

**15—30 САКАВІКА** на філалагічным, эканамічным факультэтах і факультэце філасофіі і сацыяльных навук (вул. К. Маркса, 31) працуюць выставы "Абаронца праўды Ф. Багушэвіч" (да 165-годдзя з дня нараджэння) і "Аднавіла партрэт свайго пакалення", прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння В.Ф. Пановай.

***

На працягу ўсяго сакавіка на радыёфізічным і біялагічным факультэтах (вул. Курчатава, 5) дзейнічаюць выставы "Чароўны свет птушак" і "Беларуская эканоміка: праблемы і перспектывы".

***

**22—29 САКАВІКА** на юрыдычным факультэце (вул. Маскоўская, 17) наладжана выстава "Арганізацыя і дзейнасць натарыяту".

***

На хімічным факультэце (вул. Ленінградская, 14) можна пазнаёміцца з шэрагам выстаў: **14—24 САКАВІКА** "Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — прававая аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы" (да Дня Канстытуцыі), **21—25 САКАВІКА** "Вада! Ты само жыццё!" (да Сусветнага дня вады), **24 САКАВІКА — 5 КРАСАВІКА** "Навуковыя працы кандыдата хімічных навук, дацэнта кафедры фізічнай хіміі Людвіга Антонавіча Мячкоўскага" (да 65-годдзя з дня нараджэння). Таксама да канца месяца працуе адкрыты прагляд "Даведачныя выданні па хіміі".

***

**15—31 САКАВІКА** на факультэце журналістыкі (вул. Маскоўская, 15) працуе выстава "Акно ў свет Васіля Пяскова".

***

На факультэце міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) да **18 САКАВІКА** можна ўбачыць выставу "Молатаў — паўдзяржаўны валадар" (да 115-годдзя з дня нараджэння), да **21 САКАВІКА** — "Міжнародныя мытныя адносіны". **21 САКАВІКА — 1 КРАСАВІКА** дзейнічае выстава "Банкі і крэдыт", а **22 САКАВІКА — 5 КРАСАВІКА** — "Першы рэйхсканцлер Германскай імперыі", прысвечаная 190-годдзю з дня нараджэння Ота фон Бісмарка.

**Паводле інфармацыі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

17 сакавіка 2005 года
Падпісана да друку 16.03.2005 г.
Зак. 275. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by